еврейской и другим этническим группам и оценка ими иных традиций неизбежно преломлялась сквозь собственное миропонимание своего социального, этнического и конфессионального круга. Крестьянин плохо воспитан, нуждается при выполнении работы в постоянном контроле, медлителен, склонен к пьянству, иногда демонстрирует смешное в глазах городского жителя поведение (вызванному не свойственной для него ситуацией и неумением себя вести). Но с точки зрения горожанина, у крестьян имелись и положительные черты: усердие, трудолюбие, неприхотливость, способность к мужественным, даже героическим поступкам, верность своим принципам. Кроме того, важна и обратная сторона взаимоотношений между городскими и сельскими жителями, их представление о городе и его жителях. Внешняя легкость быта по сравнению с сельским трудом, красочность и привлекательность окружающего пространства, наличие многих вариантов в формах досуга и пр. давало основание крестьянину с некоторой долей негатива (насмешкой, презрением) смотреть на городских жителей как на «гультаев», испытывать чувство зависти по отношению к беззаботной жизни представителей ряда городских сословий.

Вместе с тем очевидно неотъемлемое включение сельского компонента культуры в городской образ жизни в Беларуси начала XX в. И также заметна роль, которая принадлежала крестьянскому сословию в городах, связанная как с материальным обеспечением городских жителей (поставка продуктов, предметов домашнего обихода и пр.), сферой производства и транспортных, бытовых услуг, так и с воздействием на городскую культуру.

**Литература и источники**


1 Шыбека, З.В. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З.В. Шыбека, С.Ф. Шыбека. – Мінск: Полымя, 1994. – 341 с.
2 Гомельское слово. – 1912. – 3 янв.
3 Некрылова, А. Русские народные городские праздники, увеселения и зрелища. Конец XVIII – начало XX века / А. Некрылова. – СПб.: Азбука-классика, 2004. – 256 с.
4 Гомельское слово. – 1911. – 16 сент.
5 Гомельская мысль. – 1914. – 20 апр.
6 Гомельская копейка. – 1916. – 6 июля.
7 Гомельская копейка. – 1913. – 15 мая.
8 Гомельская копейка. – 1912. – 23 июля.
9 Гомельская копейка. – 1914. – 30 июня.
10 Гомельское слово. – 1911. – 25 сент.
11 Гомельская мысль. – 1914. – 5 июня.
12 Гомельское слово. – 1911. – 22 апр.


## ІНФРАСТРУКТУРА ГАРАДОЎ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КУЛЬТУРНАГА АСЯРОДДЗЯ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА


*Казаковіч В.Б., выкладчык, БДПУ, г. Мінск*
*Леўковіч Н.Д., дацэнт, БДПУ, г. Мінск*


У канцы XIX – пачатку XX ст. гарады беларускіх губерняў выступалі як цэнтры фарміравання культурнага асяроддзя буржуазнага грамадства. Спалучыўшы мноства тэндэнцый культурнага развіцця горада і вёскі, сталіцы і правінцыі, яны садзейнічалі інтэграцыі сацыякультурных працэсаў, аказвалі вызначальны ўплыў на духоўны і культурны стан насельніцтва Беларусі.

Фарміраванне культурнага асяроддзя вызначалася шэрагам фактараў, важную ролю сярод якіх адыгрывалі не толькі адміністрацыйны статус гарадоў і наяўнасць культурна-адукацыйных устаноў, але і гаспадарча-эканамічны ўзровень іх развіцця, гарадская інфраструктура і інфармацыйная сістэма. Інфраструктура гарадской гаспадаркі, выступаючы важнейшай характэрнай рысай парэформеннага горада, уяўляла сабой складаную сістэму, якая патрабавала свайго развіцця і мадэрнізацыі.

З другой паловы XIX ст. гарады беларускіх губерняў паступова набываюць рысы капіталістычнага горада, якія ў пэўнай ступені вызначаліся і планавай забудовай, і структурай жылых дамоў, і выкарыстаннем сучасных



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

для таго часу будаўнічых матэрыялаў. Аднак патрэбна вызначыць, што пры пэўных станоўчых зрухах у гарадскім будаўніцтве і ў канцы XIX ст. драўляныя жылыя пабудовы пераважалі не толькі ў павятовых, але і ў губернскіх гарадах. Так, у Мінску ў 1897 г. налічвалася 6 616 жылых дамоў, з якіх 5 589 былі драўлянымі, што складала 84,4 % [1, с. 530]. Праўда, у 1904 г. працэнт драўляных жылых дамоў у Мінску скараціўся да 81,0 %, хоць у губернскіх гарадах Магілёве і Віцебску гэты паказчык складаў акаля 90,0 % [2, с. 165–166]. Драўлянымі дамамі забудоўваліся пераважна гарадскія ўскраіны, дзе горад як бы непрыкметна пераходзіў у вёску. Такімі жылымі дамамі былі забудаваны ў Мінску – слабоды Камароўка, Серабранка, Грушаўка, Кальварыя, у Гродне – прадмесце Гараднiца, ў Магілёве – Карабанаўка і інш. [1, с. 530; 4, с. 204]. У гэтых адносінах зусім мала змен адбылося ў павятовых гарадах, што мелі сельскі выгляд са сваімі аднапавярховымі драўлянымі дамамі і невялікімі садамі і агародамі.

У наступныя гады адзначаецца дынаміка росту мураваных пабудоў у гарадах і выкарыстанне новых будаўнічых матэрыялаў. Калі яшчэ ў 1904 г. у гарадах Мінскай губерні не было ніводнага жылога будынку, пакрытага чарапіцай, то ўжо ў 1910 г. налічвалася 54 такіх пабудовы. Значна лепшымі паказчыкамі ў гэтым плане вызначаліся гарады Гродзенскай губерні і гарады беларускіх уездаў Віленскай губерні. Тут колькасць жылых пабудоў, пакрытых чарапіцай, за адзначаны час адпаведна павялічылася з 494 да 7 850 домоў і з 460 да 5 654 дамоў. Аднак пераважная большасць жылых дамоў і драўляных пабудоў у гарадах заставаліся пакрытымі саломай, дранкай, жалезам і толлю [5, с. 68–71; 6, с. 1–2]. Безумоўна, усе гэтыя факты з'яўляюцца засведчаннем значнага ўплыву сельскага наваколля на культурны быт гарадскога насельніцтва і падобнасцю культурнага жыцця ў гарадах і вёсках.

Немалаважны ўплыў на развіццё гарадской інфраструктуры аказвала адносна высокая шчыльнасць насельніцтва, якой вызначаліся губернскія гарады і гарады з буйнымі чыгуначнымі станцыямі. Так, у губернскіх гарадах Мінску і Гродне ў 1904 г. насельніцтва адпаведна складала 16,6 і 15,2 жыхароў на жылую пабудову, у Оршы – 14,3, Лідзе – 15,0, Слуцку – 16,0, а ў Брэст-Літоўску яна дасягала 19,8 жыхароў на жылую пабудову [5, с. 68–71]. У сувязі з ростам гарадскога насельніцтва і павелічэннем яго шчыльнасці ўзрасла патрэба ў найме жылля і ўзнікла неабходнасць у будаўніцтве шматпавярховых новых тыпаў будынкаў: даходных і начлежных дамоў, народных дамоў і інш.

Фарміраванне спецыфічнага гарадскога асяроддзя было звязана з развіццём такіх форм абслугоўвання, як гасцініцы, пастаялыя двары, корчмы, харчэўні, чайныя і інш. Паводле статыстычных даных, амаль ва ўсіх гарадах беларускіх губерняў меліся гасцініцы і пастаялыя двары і іх колькасць у 1904 г. склала 709 адзінак, а корчмы, харчэўні і чайныя – 617 адзінак. Найбольшай колькасцю такіх форм абслугоўвання вызначаліся гарады Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў, дзе адпаведна працавала 252, 218 і 146 гасцініц і пастаялых двароў [2, с. 164–165].

Пад уплывам капіталістычных працэсаў гарады станавіліся цэнтрамі развіцця новай крэдытна-фінансавай сістэмы, адыгрываўшай важную ролю ў фінансаванні прамысловасці, гандлю, чыгуначнага будаўніцтва, прадпрымальніцкай сельскай гаспадаркі. Зразумела, што ўсё гэта суправаджалася будаўніцтвам крэдытных, страхавых, камісійных устаноў і натарыяльных кантор. У 1904 г. у павятовых і губернскіх гарадах Беларусі налічвалася 33 банкі і аддзяленні, 13 таварыстваў узаемнага крэдытавання, 23 банкірскія канторы, 36 пазыка-ашчадных кас, 57 натарыяльных кантор [2, с. 156–157].

У гарадах беларускіх губерняў у 1904 г. налічвалася 422 медыцынскія ўстановы, з якіх было 78 бальніц, 87 аптэк і 244 аптэкарскія крамы. Найбольшая колькасць медыцынскіх устаноў была засяроджана ў губернскіх гарадах, з якіх вылучаўся Мінск. Тут дзейнічала 11 бальніц, 3 прыёмныя пакоі, 9 аптэк і 33 аптэкарскія крамы [5, с. 86–87].

Зразумела, што такая накіраванасць гарадскога будаўніцтва патрабавала ўвядзення самых разнастайных грамадскіх паслуг: брукавання вуліц, вулічнага асвятлення, сістэмы водазабеспячэння, каналізацыі і інш. Сведчаннем развіцця гарадской інфраструктуры ў кірунку яе мадэрнізацыі з'яўлялася і пытанне аб асвятленні вуліц і плошчаў беларускіх гарадоў. Нават у пачатку XX ст. у вулічным асвятленні беларускіх гарадоў пераважалі газавыя (керосиновые) ліхтары. Праўда, дзякуючы тэхнічнаму прагрэсу, у 1895 г. дала ток 1-ая Мінская электрастанцыя для асвятлення вуліц, гарадскога тэатра, адміністрацыйных будынкаў [7, с. 13, 447]. У 1904 г. Мінск з агульнай колькасці вулічных ліхтароў меў 388 электрычных, а 923 заставаліся газавымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1911 г. ужо 3 гарады мелі электрычнае асвятленне, аднак ва ўсіх астатніх павятовых і губернскіх гарадах захоўвалася газавае асвятленнне вуліц [2, с. 167–169].

У шэрагу беларускіх гарадоў добраўпарадкаванне не абмяжоўвалася брукаваннем цэнтральных вуліц і вулічным асвятленнем, а праяўлялася і ў мадэрнізацыі іншых галін камунальнай гаспадаркі. У 1911 г. практычна ва ўсіх гарадах беларускіх губерняў меліся збудаванні і прадпрыемствы камунальнага і санітарнага добраўпарадкавання. Прычым у Мінскай губерні такіх гарадоў было 26, у Магілёўскай – 13, у Віцебскай – 12, у Гродзенскай – 12, у Віленскай – 10 [2, с. 169]. На будаўніцтва прадпрыемстваў камунальнага і санітарнага добраўпарадкавання неабходны былі значныя фінансавыя затраты, якія забяспечваліся за кошт гарадскога бюджэту. Прыкладам таму могуць служыць гарадскія даходы і расходы ў Віцебскай губерні за 1910 г. Сума ўсіх гарадскіх даходаў за 1910 г. склала 1 125 428 руб. 45 кап., а сума ўсіх гарадскіх расходаў – 1 098 589 руб. 57 кап., з якіх 81,0 % былі патрачаны на гарадское добраўпарадкаванне, фінансавыя аперацыі, санітарныя і будаўнічыя службы, дабрачыннасць, вучэбную частку і інш. [2, с. 169].

Новыя кірункі гарадскога будаўніцтва выклікалі неабходнасць санітарнага добраўпарадкавання праз сістэму водаправодаў і каналізацыі. У 1878 г. у цэнтральныя кварталы Магілёва быў праведзены водаправод [1, с. 337], а ў 1879 г. у эксплуатацыю быў здадзены водаправод у Мінску, які забяспечваў вадой цэнтральныя вуліцы горада. Будаўніцтва водаправода ў Мінску пачалося яшчэ ў 1872 г., а ў 1873 г. на беразе Свіслачы пры яе скрыжаванні з вуліцай Захар'еўскай былі пабудаваны Бруклінскія студні, помпавая станцыя і пракладзена 1,5 км. чыгунных водаправодных труб [7, с. 13, 122]. Паступова водаправодная сістэма ўводзілася і ў іншых гарадах беларускіх губерняў.

Адным з важнейшых кірункаў мадэрнізацыі стала чыгуначнае будаўніцтва, якое пераўтварыла ў буйныя чыгуначныя вузлы, гандлёва-прамысловыя і культурныя цэнтры губернскія і шэраг павятовых гарадоў. Чыгуначныя шляхі, што звязалі паміж сабой ускраінныя рэгіёны з цэнтрам і паміж сабой, садзейнічалі росту рухомасці насельніцтва, узмацненню культурнага ўзаемаўплыву і культурнага ўзаемаабмену паміж гарадам і вёскай.

Інфраструктура гарадской гаспадаркі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. узбагачалася будаўніцтвам чыгуначных вакзалаў, дэпо і трамвайных ліній. Так, значны ўплыў на планіровачную структуру горада Гродна аказала будаўніцтва ў 1868 г. чыгуначнага вакзала і Прывакзальнай плошчы [4, с. 204]. У 1871 – 1874 гг. у Мінску былі пабудаваны Брэсцкі і Віленскі чыгуначныя вакзалы, 2 дэпо, рамонтныя майстэрні [1, с. 530]. У 1902 г. былі пабудаваны пасажырская і таварная станцыі ў Магілёве, разам з будынкам чыгуначнага вакзала размяшчалася Прывакзальная плошча [1, с. 337]. У 1866 г. чыгунка Рыга – Арол прайшла праз Віцебск, а пабудаваныя вакзал і Прывакзальная плошча склалі новы кампазіцыйны цэнтр правабярэжнай часткі горада. Як від грамадскага транспарту ў Віцебску ў 1898 г. быў пушчаны першы трамвай [3, с. 635]. Усё гэта надавала гарады беларускіх губерняў, прыдавала ім цывілізаваны выгляд.

Прыкметнай рысай мадэрнізацыі беларускіх гарадоў стала развіццё інфармацыйнай сістэмы, якая ўключала пошту, тэлеграф і тэлефон. З 1859 г. у Мінску пачаў дзейнічаць тэлеграф, а першая лінія сувязі была ўстаноўлена паміж Мінскам і Бабруйскам. Да 1905 г. правадныя лініі тэлеграфа злучылі Мінск з Оршай, Вільняй, Варшавай і іншымі гарадамі [7, с. 399]. Прагрэсіўная сістэма сувязі ў выглядзе тэлефона ў канцы XIX – пачатку XX ст. прыйшла і ў Беларусь. Тэлефонная сувязь у Мінску з'явілася яшчэ ў 1890 г. У 1896 г. была пабудавана тэлефонная станцыя на 100 нумароў у будынку паштова-тэлеграфнай сувязі па вуліцы Губернатарскай [7, с. 399]. У 1911 г. тэлефонную сувязь мелі 10 гарадоў беларускіх губерняў, з якіх 4 гарады знаходзіліся ў Мінскай губерні, па 2 горады – у Віцебскай і Гродзенскай губернях, і па адным горадзе – у Магілёўскай і Віленскай губернях [2, с. 169].

У далейшым інтэнсіўнасць тэлеграфнага і тэлефоннага абмену інфармацыяй павялічвалася, што ў значнай ступені садзейнічала пераадольванню грамадскай замкнутасці, пашырэнню эканамічных сувязей, наладжванню асабістых стасункаў. Праз пашырэнне тэлефоннай сеткі і далучэння да яе новых абанентаў у агульны працэс мадэрнізацыі эканамічнага і культурнага жыцця актыўна ўключаліся ўсё больш шырокія колы грамадства.

Безумоўна, усе гэтыя зрухі ў інфраструктуры гарадской гаспадаркі былі хутчэй сведчаннем намечаўшайся тэндэнцыі, а не рэальным добраўпарадкаваннем горада. Тым не менш беларускія гарады з іх асабістым

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

адміністрацыйным статусам, камунікацыйнай і інфармацыйнай сеткай, культурна-адукацыйнай структурай з'яўляліся важнейшым асяродкам мадэрнізацыі грамадства, садзейнічалі інтэграцыі сацыякультурных працэсаў, што вызначалі асноўныя напрамкі культурнага і духоўнага жыцця беларускага краю ў другой палове XIX - пачатку XX ст.


### Літаратура і крыніцы

1. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1984 – 1987 – Т. 3: Карчма – Найгрыш. –1986. – 751 с.
2. Документы и материалы по истории Белоруссии: в 4 т. / В.Н. Перцев [и др.]; под ред. В.Н. Перцева. – Минск: Акад. наук БССР, 1936 – 1954. – Т. 3: Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.) / В.Н. Перцев [и др.]; под ред. В.Н. Перцева. – 1953. – 1018 с.
3. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1984 – 1987 – Т. 1: Акапэла – Габелен. – 1984. – 727 с.
4. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1984 – 1987 – Т. 2: Габой – Карціна. – 1985. – 702 с.
5. Статистический сборник «Города России в 1904г.»: стат. сб. / Центр. стат. ком. МВД. – СПб, Типо-литогр. Ныркина, 1906. – 907 с.
6. Статистический ежегодник России, 1914 год / Центр. стат. ком. МВД. – Петроград, 1915. – 702 с.
7. Минск: энцикл. справ. / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.] – 2-е изд., доп., перераб. – Минск: БелСЭ, 1983. – 467 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ ЯЎРЭЯЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIX ст.

*Іоффе В.Г., кандыдат гістарычных навук, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск*

Традыцыйная сістэма адукацыі фарміравалася ў яўрэяў са старажытных часоў. Адным з галоўных абавязкаў яўрэйскай грамады было выхаванне адукаванага падрастаючага пакалення. Крыніцай ведаў для іх з'яўлялася Тора, таму сістэма адукацыі будавалася на рэлігійнай аснове [2, с. 29].

Кожны кагал пад пагрозай адлучэння ад сінагогі павінен быў утрымліваць пачатковую школу. Пачатковую адукацыю можна было атрымаць у прыватных настаўнікаў-меламедаў або ў школах: хедарах талмуд-торах. Талмудысты лічылі, што адукацыя павінна быць бясплатнай, паколькі Закон быў дадзены яўрэяў бясплатна. Гэтага прынцыпу безумоўна прытрымліваліся ў вышэйшых навучальных установах – іешывах (ешыботах), але для пачатковай адукацыі было зроблена выключэнне. Таму колькасць тых, хто атрымоўваў адукацыю, у яўрэяў была значна большай, чым у хрысціян [2, с. 30].

Гродзенскі даследчык І. Соркіна, характарызуючы стан яўрэйскай традыцыйнай адукацыі XIX ст., адзначала, што «дзейнасць яўрэйскіх навучальных устаноў немагчыма ацаніць адназначна. З аднаго боку, яны ўносілі ў яўрэйскае асяроддзе пісьменнасць, прывівалі любоў да рэлігійных і нацыянальных традыцый, а з іншага – нельга не заўважыць аднабаковасць гэтай асветы (адсутнасць свецкіх прадметаў) і невысокі ўзровень адукацыі настаўнікаў, якія ў большасці сваёй мелі толькі «хатнюю адукацыю» [5, с.71].

Маючы на мэце ўніфікацыю насельніцтва імперыі і ўлічваючы той відавочны факт, якое важнае месца ў штодзённым жыцці яўрэяў займала менавіта адукацыя, расійскія манархі адным са сродкаў асіміляцыі яўрэяў выбралі менавіта рэфармаванне іх традыцыйнай сістэмы адукацыі.

Спачатку змены ажыццяўляліся даволі памяркоўна. Так, «Палажэнне аб яўрэях» 1804 г. дазваляла паступаць яўрэям у расійскія навучальныя ўстановы ўсіх тыпаў, праўда пры гэтым патрабавалася навучэнцам адмовіцца ад традыцыйнай яўрэйскай вопраткі ў сценах навучальных установаў. Але яўрэі ігнаравалі дзяржаўныя школы і ўхіляліся ад вывучэння рускай мовы.

13 лістапада 1844 г. было зацверджана «Палажэнне аб яўрэйскіх прыватных навучальных установах і выпускніках настаўніках», якое павінна было рэгуляваць працэс навучання яўрэйскай моладзі. Паводле гэтага «Палажэння», да ліку дзяржаўных навучальных устаноў адносіліся казённыя яўрэйскія вучылішчы 1-га і 2-га разрадаў, якія падпарадкоўваліся Міністэрству адукацыі. У сакрэтнай інструкцыі да ўказа адзначалася, што